

Установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці»

# «Юраўскі карагод» запрашае сяброў...»

**Вёска Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці**



г.Гомель
2012

Тэкст: Л.Г. Мельнікава
Фота: І.В.Глушэц
Макет К.У. Ціханава
Камп'ютарны набор Н.С. Куляшова
Адказны за выпуск М.І. Шамшэня
Надрукавана ўстановай «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці»
Адрас:246022, г.Гомель, вул. Кірава, 49.
Тэл.77-50-95


















Гомельшчына – запаведны край традыцыйнай народнай культуры. Вёска Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці менавіта такое месца. Яна цесна звязана са старадаўнім Туравам сваёй гісторыяй, мінулай і сучаснай культурай.

Веснавое народнае свята Юр’е вось ужо на працягу многіх стагоддзяў штогод праходзіць 6 мая ў Пагосце. Зараз трымае векавую традыцыю фальклорна-этнаграфічны калектыў “Міжрэчча”. У старажытнасці на Юр’е на Тураўшчыне вадзілі быка, ролю якого цяпер выконвае пышны хлеб, які, як і сам абрад, называецца “карагод”. Жанчыны яго пякуць з раніцы і ўпрыгожваюць трыма галінкамі пладовага дрэва. На кожнай павінна быць па тры парасткі з кветкамі – усяго дзевяць. Столькі месяцаў працягваецца цяжарнасць жанчыны. Гэтым абрадам ушаноўваецца ўрадлівасць зямлі. Граблі перавязваюцца зялёным фартухом, што сімвалізуе цнатлівасць дзяўчыны, а самі граблі – працу.

Шэсце з абразом Святога Георгія Перамоганосцы, з караваем і граблямі з фартухом выходзіць з хаты і праходзіць праз сімвалічныя “вароты”, створаныя з рушнікоў, і з прытанцоўкамі і прыпеўкамі накіроўваецца да Панскага поля за сяло, каб “праславіць Юр’е” і папрасіць у Бога благаслаўлення “на буйнае жыта, на цёплае лета”.

Падыходзячы да поля, пагашчанцы сціхаюць і прыпыняюцца на ўскрайку поля. Потым праз “вароты” з рушнікоў праходзяць у жытняе поле, дзе адбываецца самы ўрачысты момант галоўнага карагода, які пачынаецца з абрадавай песні “Ой, прыйшлі на поле, дай папросім Бога адмукнуць зямліцу…”. Жанчыны становяцца ў кола і пачынаюць па ходу сонца вадзіць карагод, пры гэтым яны спяваюць “Дай урай, маці, ключы…”. У цэнтры карагода знаходзяцца тыя, хто трымае абрадавую атрыбутыку: абраз, каравай і граблі з зялёным фартухом. Яны таксама рухаюцца па ходу сонца і тры

разы падымаюць уверх каравай. Далей удзельнікі абраду здымаюць зялёны фартух з грабляў і чапляюць ужо чырвоны, што азначае, што дзеўка ўжо гатова да дзетанараджэння, як і сама зямля – да будучага ўраджаю.

Пасля гэтага народны карагод ідзе гуляць па вёсцы, спыняючыся ля кожнай хаты, звяртаецца за дазволам да гаспадароў вадзіць карагод, якія радуюцца, што да іх завіталі ў госці. Па заканчэнні карагоднай песні ўдзельнікі карагода жадаюць гаспадарам добрага здароўя, багатага ўраджаю, прыбытку ў хляве. Тыя дзякуюць і выносяць ім “падзяку” – хлеб, яйкі, грошы і гарэлку. У пераходах ад адной хаты да другой жыхары вёскі, удзельнікі фальклорна-этнаграфічнага гурта “Міжрэчча” спяваюць прыпеўкі пад гармонік, скачуць.

З’яўляючыся жывой формай аднаго з аўтэнтычных абрадаў веснавога цыкла і адметнай характэрнай для палескага рэгіёну традыцыяй, абрад уключае ў сябе

выдатныя ўзоры старажытных карагодаў і песень, а таксама такіх матэрыяльных праяў рэгіянальнай культуры, як народны касцюм і абрадавы хлеб (каравай).

Таму невыпадкова, што старажытны абрад “Юраўскі карагод” першы ў Беларусі ў 2005 годзе атрымаў статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці рэспубліканскага значэння. Як невыпадкова і тое, што ў рэйтынгу амерыканскай тэлекампаніі CNN вёска Пагост Жыткавіцкага раёна ў 2010 годзе ўвайшла у топ-10 лепшых мясцін свету для святкавання калядаў.